УДК 372.881.1

# АСНОЎНЫЯ ФОРМЫ, МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ РАБОТЫ НАСТАЎНІКА НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ, ЯКІЯ АКТЫВІЗУЮЦЬ ПАЗНАВАЛЬНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ ВУЧНЯЎ

**Ларыёнава Галіна Віктараўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
дзяржаўнай установы адукацыі
"Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва"
(г. Магілёў, Беларусь)
mogilev_school39@octroo.datacenter.by

*У артыкуле разглядаюцца асноўныя формы, метады і прыёмы работы настаўніка на ўроках беларускай літаратуры, якія актывізуюць пазнавальную дзейнасць вучняў.*



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Для вучняў-падлеткаў вучэбная дзейнасць страціла сваё вядучае месца ў жыцці. Якія ж прагрэсіўныя педагагічныя прыёмы і метады можна выкарыстоўваць на ўроках літаратуры з мэтай развіцця і фарміравання пазнавальнай дзейнасці вучняў?

Важнымі, на маю думку, з’яўляюцца прыёмы, якія неабходна ўлічваюць пры пастаноўцы пытанняў і атрыманні на іх адказаў. Да іх адносяцца: час на абдумванне адказу, пастаноўка пэўных недвухсэнсоўных пытанняў, падача зваротнай сувязі на кожны адказ вучня, пастаноўка ўдакладнюючых пытанняў ці пытанняў на роздум, заахвочванне вучняў дакладна прыводзіць прыклады, якія пацвярджаюць зробленыя высновы.

На працягу ўрока нельга забываць пра стварэнне сітуацыі поспеху, праз выкарыстанне фраз: ведаю, што вы здольны на большае; вы справіцеся з гэтай задачай; прапаную цікавае і карыснае заданне.

Каб урок быў цікавым, трэба прытрымлівацца прынцыпу навізны. Пры вывучэнні біяграфіі пісьменніка можна прапанаваць вучням пашукаць пра яго цікавыя факты, якія могуць зацікавіць дзяцей. Цікавая форма работы – знайсці 10 фактаў пра…. Дзеці знаходзяць інфармацыю, якой няма ў школьным падручніку. Пісьменнік паўстае перад вучнямі як рэальная асоба, і вывучэнне твораў будзе больш запамінальным і яркім.

Эфектыўным з’яўляецца і метад прагназавання. Чытаючы новы твор, спыняюся на самым цікавым ці напружаным моманце і прапаную вучням прадказаць далейшае развіццё падзей. Тут і пачынаецца самае неверагоднае. Некаторыя варыянты бываюць вельмі цікавымі. Потым вучні дачытваюць твор і выказваюць свае меркаванні: які варыянт больш спадабаўся і чаму. Гэты від работы над творам выпрацоўвае ў вучняў уменне прагназаваць далейшае развіццё падзей, складаць звязны тэкст, паслядоўна выказваць свае думкі перад класам. Выкарыстоўваць прыём прагназавання можна пры аб’яўленні тэмы ўрока. Даць назвы ўжо вядомых вучням твораў, папрасіць вызначыць іх аўтара, успомніць сапраўднае імя, біяграфічныя звесткі. Напрыклад, пры вывучэнні урыўка “Дзядзька-кухар” з паэмы “Новая зямля” Якуба Коласа напомніць творы “Дарэктар”, “На рэчцы”, папрасіць назваць аўтара і яго сапраўднае імя.

Часта вучні чытаюць тэкст у кароткім змесце. Можна на ўроку падаць гэты тэкст з памылкамі. Вучні, працуючы ў парах, знаходзяць памылкі і падкрэсліваюць іх. Гэтаму садзейнічае веданне гістарычных абставін, час, калі пісаўся твор, асабісты вопыт вучняў, лагічнае мысленне. Вядома, тэкст павінен быць невялікім па змесце.

На ўступных занятках па вывучэнні паэмы Янкі Купалы “Бандароўна” (9 клас) вучням трэба размясціць часткі паэмы ў лагічнай паслядоўнасці,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

карыстаючыся планам, які прапанаваў настаўнік (пункты плана знарок пераблытаны). Работа ў групах спрыяе ўдзелу ў рабоце ўсіх навучэнцаў.

Прыём "Алітэрацыя імя" дзейсны на падагульняючым этапе пры вывучэнні твора. Напрыклад, пры рабоце над аповесцю В. Быкава "Жураўліны крык" (8 клас) прапаную вучням падабраць эпітэт-азначэнне на літару, з якой пачынаецца імя героя, каб раскрыць іх характар (Карпенка: камандзір, кампетэнтны, крыклівы, клапатлівы; Фішар: флегматычны, філосаф).

Метад "Гасцініца" будзе садзейнічаць развіццю ўменняў абагульняць, параўноўваць, рабіць высновы, разважаць. Аповесць В. Быкава "Жураўліны крык": "Уявіце сябе адміністратарам гасцініцы. Вам трэба размясціць герояў аповесці так, каб усім было зручна і камфортна. Ёсць тры свабодныя нумары: аднамесны, двухмесны і трохмесны. Вашы прапановы? Абгрунтуйце іх (аднамесны – Карпенка; двухмесны – Аўсееў і Пшанічны; трохмесны – Свіст, Глечык, Фішар)." Такім чынам, героі размяркоўваюцца па іх статусе ў атрадзе і ў адпаведнасці з тым выбарам, які яны робяць, апынуўшыся ў складаных абставінах.

Метад "5" з "25" выкарыстоўваю падчас характарыстыкі героя. Так, пры характарыстыцы вобразаў Міхала і Антося (паэма Якуба Коласа "Новая зямля") вучні атрымліваюць дыдактычны матэрыял, дзе пералічваецца 25 варыянтаў адказу з рысамі нацыянальнага характару беларусаў, каб атрымаўся пералік важных паняццяў. Кожны вучань павінен сам выбраць з прапанаванага пераліку 5 рыс, якія ён лічыць характэрнымі для вобразаў герояў (спачатку для вобраза Міхала, затым – Антося). Калі кожны вучань вызначыўся з выбарам, клас дзеліцца на групы па 5-7 чалавек. У групе дзеці разам выбіраюць агульныя 5 рыс, з якімі згодны ўсе члены падгрупы. Выбар робіцца шляхам дыскусіі, пераканання. На дошцы адводзіцца месца для запісу вынікаў выбару кожнай групы. Прадстаўнікі кожнай групы прэзентуюць свае вынікі, такім чынам тлумачаць свой выбар. Каштоўнасць выкарыстання метада ў тым, што працэс навучання робіцца жывым і займальным. Навучэнцы лягчэй засвойваюць вучэбны матэрыял, актывізуецца разумовая дзейнасць вучняў, яны вучацца аргументаваць, пераконваць, дасягаць згоды.

Метад "Рэкламная кампанія". Пасля вывучанага твора прапаноўваю зрабіць да яго рэкламны плакат ці афішу да спектакля на вывучаную п'есу. Гэта заданне заўсёды выконваецца вучнямі з задавальненнем. Дазваляецца працаваць індывідуальна, у парах, групах.

Выкарыстанне названых метадаў і прыёмаў у адпаведнасці з мэтай урока, зместам вучэбнага матэрыялу, улікам індывідуальных асаблівасцей



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

прыводзіць да змены адносін вучняў да працэсу навучання, павышае цікавасць і матывацыю да прадмета.

**Спіс літаратуры**

1. Барановский, Д. Н. Интерактивное взаимодействие. Мотивация, креативность, исследовательский компонент // Народная асвета. – 2006. – № 7. – С. 13–15.

2. Ермаковіч, С. Рыхтаваць вучня да самастойнага жыцця / С. Ермаковіч // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 12. – С. 18–19.

3. Марук, І. Імкнуцца быць крэатыўнай асобай / І. Марук // Беларуская мова і літаратура. – 2008. – № 12. – С. 21–23.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова